# Мяняецца вёска, растуць людзі

Калі праязджаеш каля Баханоў, адразу бачыш, што гэта вялікая вёска. Яе вуліцы працягнуліся ад асфальтаванай шашы аж да самых берагоў Бесядзі. У вёсцы каля тысячы жыхароў. У большасці сваёй гэта патомныя хлеборобы, працаўнікі палёў і ферм калгаса «Чырвоны маяк».

Старажылы Баханоў яшчэ добра памятаюць, якой была вёска да Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Нізенькія драўляныя хаты з маленькімі акенцамі і саламянымі стрэхамі. Праўда, былі тут і вялікія дамы, крытыя жалезам. Але жылі ў іх не сяляне-хлебаробы, а служкі царквы, якая была ў вёсцы.

Шмат часу прайшло з таго дня, як у Баханы прыйшла Савецкая ўлада. Арганізаваліся першыя калектыўныя гаспадаркі «Новыя Баханы» і «Чырвоны маяк», якія потым аб'ядналіся ва ўзбуйнены калгас «Чырвоны маяк». Стваральную працу калгаснікаў перарваў вераломны напад на нашу Радзіму нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Многія жыхары вёскі не дачакаліся свята вызвалення, а тыя, якія пасля перамогі вярнуліся дадому, адразу ж узяліся за аднаўленне грамадскай і асабістай гаспадарак. Не ведалі стомы ні малыя, ні старыя. Яны будавалі дамы, грамадскія памяшканні, апрацоўвалі палеткі, даглядалі жывёлу, вырошчвалі хлеб.

Праца людзей давала свае вынікі. З году ў год Баханы становіліся прыгажэйшымі, добраўпарадкаванымі, рос культурны ўзровень і матэрыяльны дабрабыт калгаснікаў.

Зараз вёску не пазнаць. Рэдка дзе засталіся дамы калгаснікаў з саламянымі стрэхамі. Цяпер у баханцаў новыя, пад шыфёрным накрыццём, дамы. Старшыня праўлення калгаса Іван Ігнатавіч Праконенка гаворыць:

— Калі ўзяць апошнюю пяцігодку, то ў нас штогод будавалася ў сярэднім 12 новых дамоў. Гэта не лічачы тых, якім рабіўся капітальны рамонт. Вялікую дапамогу хлебаробам аказвае ў гэтым праўленне калгаса. Мы дапамагаем ім нарыхтоўваць матэрыял, вывозіць яго. Напрыклад, у мінулым годзе сіламі калгаса была аказана дапамога ў пабудове дома даярцы-пенсіянерцы Ганне Якаўлеўне Антоненка, даглядчыцы адкормнікаў буйной рагатай жывёлы Акуліне Пятроўне Аўсеенка, паляводу Яфіму Кірылавічу Максіменку і многім другім.

У гаспадарцы будуюцца і кватэры для паляводаў, жывёлаводаў і спецыялістаў калгаса за кошт грамадскага фонду. У іх справілі наваселле эканаміст калгаса Ганна Лявонаўна Гусева, учотчык свінагадоўчай фермы Аляксей Андрэевіч Кастроў, калгасніца-пенсіянерка Гапярына Сямёнаўна Аўчыннікава.

Аб росце матэрыяльнага дабрабыту гаворыць і такая лічба: у вёсцы зараз налічваецца 11 тэлевізараў, дзесяткі радыёпрыёмнікаў, 8 матацыклаў, дзесяткі пральных машын і шмат іншай бытавой тэхнікі. Усё гэта яны набываюць у мясцовым магазіне, які летась уступіў у строй. Гэты будынак, вялізны, са шкляным фасадам, вельмі ўпрыгожвае вёску. Да паслуг баханцаў таксама і бытавая майстэрня, дзе з густам выконваюць заказы аднавяскоўцаў закройшчыца Афанасся Пятроўна Будзянкова, швачкі Марыя Якаўлеўна Ляпшова і Лідзія Ульянаўна Зямцова.

Ёсць у вёсцы сярэдняя школа, фельчарска-акушэрскі пункт. Любімым месцам адпачынку баханцаў стаў калгасны клуб. Пры ім стацыянарная кінаўстаноўка і багатая кнігамі бібліятэка.

Не верыцца зараз баханцам, што калісьці яны вечарамі палілі газнічкі. Зараз у кожным доме гарaць лямпачкі Ільіча, асвятляюць яны і вуліцы. У гаспадарцы на сённяшні дзень налічваецца 45 электраматораў, якія аблягчаюць працу калгаснікаў.

А колькі сваіх перадавікоў калгаснай вытворчасці! Толькі напярэдадні 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна 34 з іх былі ўзнагароджаны юбілейнымі медалямі «За доблесную працу». А свінарка Ніна Давыдаўна Сотнікава атрымала Ганаровую грамату Вярхоўнага Савета БССР.

Але, як кажуць, не хлебам адзіным жыве чалавек. Аб тым, як цягнуцца баханцы да ведаў, сведчыць той факт, што каля 29 працаўнікоў гаспадаркі маюць спецыяльную сельскагаспадарчую адукацыю. А колькі з гэтай вёскі выйшла настаўнікаў, інжынераў, урачоў! Ёсць два кандыдаты навук.

— Узяць, да прыкладу, брыгадзіра трактарнай брыгады Міхаіла Іванавіча Старасценку, — гаворыць кіраўнік калгаса. — І работа, і сям'я ў важака механізатараў. Але ён знаходзіць час для таго, каб вучыцца, павышаць свой культурны ўзровень. Сёлета ён заканчвае 11-ы клас завочнай сярэдняй школы. І абяцае, што на гэтым не спыніцца. Абавязкова паступіць у тэхнікум.

З кожным годам мяняе свой аблічча вёска Баханы. Усё гэта — справа рук яе працавітых жыхароў, якія робяць усё для таго, каб і надалей вёска расла і прыгажэла.

Л. СКАЧКОВА.

**Скачкова, Л. Мяняецца вёска, растуць людзі** / Л. Скачкова // Шлях Кастрычніка. — 1970. — 10 лістапада. — С. 2.
*Вёска Баханы Хоцімскага раёна*.